3. Чаще всего варианты встречаются на лексическом уровне. Также на этом уровне встречаются варианты, которые отличаются стилистической окраской и сферой употребления.

4. Межъязыковые варианты могут возникать при разных переводах одного исходного греческого слова: βάλλω ‘метать, бросать’; ὁ μαργαρίτης ‘жемчуг, перл’.

5. Русский язык сохранил больше фразеологизмов церковнославянского происхождения, чем белорусский и украинский, в которых исходный библеизм часто заменяется современным лексическим эквивалентом.

Литература

1. Великий тлумачний словник сучасної української мови / Уклад. і голов. ред. В. Т. Бусел. Київ, 2001.
2. *Верещагин Е. М.* Библейская стихия русского языка // Русская речь: Сб. науч. ст. 1993. № 1. С. 90–98.
3. *Иоффе Г. А.* Словарь библейских слов и выражений. СПб, 2000.
4. *Коваль А. П.* Спочатку було Слово: Крилаті вислови біблійного походження в українській мові. Київ, 2001.
5. *Лепешаў І. Я.* Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 1–2. Мінск, 2008.
6. Словарь русского языка: В 4 т. / АН СССР. Ин-т рус. яз. М., 1985–1988.
7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. / Пад рэд. К. Крапівы (К. К. Атраховіча). Мінск, 1977–1984.

КАЛАКАЦЫІ ЛЕКСЕМЫ *ШЧАСЦЕ* Ў РУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ МОВАХ НА МАТЭРЫЯЛЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КОРПУСАЎ ТЭКСТАЎ

Х. Ю. Дамарацкая

Катэгорыя шчасця заўсёды адыгрывала важную ролю ў сістэме людскіх каштоўнасцей, а адчуванне яго хісткасці і супярэчлівасці адлюстроўвалася праз моўныя адзінкі. Як сцвярджае Г. Вежбіцкая, для кожнай культуры характэрна свая спецыфіка канатацый, якія пэўны народ звязвае з назвай эмоцыі, аднак гэта не значыць, што не існуе ўніверсальных эмоцый [8, с. 140].

Аб’ектам нашага даследавання сталі дзеяслоўныя і ад’ектыўныя калакацыі, звязаныя з моўнай рэалізацыяй катэгорыі шчасця ў польскай і рускай мовах. Аналізуючы слоўнікавыя дэфініцыі лексемы *szczęście*, можна адзначыць, што ў польскіх слоўніках пад рэдакцыяй С. Дубіша [7, с. 1502] і Б. Дуная [6, с. 1767] у якасці асноўнай семы прымаецца не душэўны стан, а знешнія абставіны, якія спрыяюць поспеху: *szczęście* – ‘сітуацыя, калі ўсё ідзе добра, згодна з імкненнямі, спадзяваннямі; шчасце, поспех’; ‘пачуццё радасці, стан эйфарыі, асалоды, задаволенасці

чым-небудзь’, ‘паспяховы збег абставін’. У «Новом словаре русского языка» *шчасце* – ‘состояние абсолютной удовлетворенности жизнью, чувство наивысшего удовольствия, радости’; ‘успех, удача; счастливый случай, счастливое стечение обстоятельств’ [1, с. 738]. Такая з’ява перш за ўсё, на наш погляд, звязана з этымалогіяй лексемы: праславянскае **sъčęstьje* этымалагізуецца са словам **čęstь* ‘частка’, ‘добрая доля (надзел)’; індаеўрапейская прыстаўка **sъ-* (**sū-*) мае значэнне ‘добры’, так што структура слова *шчасце* фактычна адлюстроўвае яго значэнне [4, с. 816]. Да таго ж у «Этымалагічным слоўніку» пад рэд. В. Борыся падаецца першаснае значэнне гэтага слова: ‘добрая частка, добрая, паспяховая здабыча (напрыклад, пры падзеле здабычы, маёмасці), якое было непасрэдна звязана з матэрыяльным жыццём славян’ [5, с. 213].

У якасці метадалагічнай базы аналізу калакацый намі была ўзята праца Дж. Лакофа «Метафары ў нашым жыцці» [3]. У сваёй кнізе вучоны прыводзіць шэраг метафар, якія неад’емна суіснуюць з намі. У ходзе даследавання быў выяўлены шэраг найбольш распаўсюджаных метафар, звязаных са шчасцем у польскай і рускай мовах, якія праяўляюцца ў калакацыях лексемы *szczęście*/*счастье*, прычым некаторыя адзінкі можна аднесці да некалькіх відаў.

Першая метафара, якая прадстаўлена ў рускай і польскай мовах – *шчасце як будынак*: рус. *рушится, стоит, находится, строится, замыкается*; польск. *rujnuje się* ‘разбураецца’. З ёй варта таксама звязаць метафару *шчасце, як суб’ект, які жыве ў будынку*: *поселяется, живет, обитает, находится*.

Другая істотная метафара, якая адносіцца да гідрасферы – *шчасце як вада*: рус. *переполняет, смывает, бьет, кипит, прольет, бьет через край, сливается, льется*; польск. *przepływa* ‘пераплывае’, *płynie* ‘плыве’, *spływa* ‘сцякае’, *głębokie* ‘глыбокае’.

Шчасце ўспрымаецца людзьмі як тэмпаральная адзінка, праз метафару *шчасце як час*: рус. *вечное, новое, минутное, сегодняшнее, вчерашнее, завтрашнее, утреннее, ночное, бывшее, будущее, недолгое, нынешнее, запоздалое, внезапное, позднее, безвременное, минутное, ежедневное, долгое, постсоветское, минутное, социалистическое, длится*; польск. *trwa* ‘доўжыцца’, *wieczne* ‘вечнае’, *przyszłe* ‘будучае’; *wczorajsze* ‘учарашняе’, *dzisiejsze* ‘сённяшняе’.

Метафара *шчасце як рэч* прадстаўляе шчасце як уласнасць ці маёмасць, прычым яно можа быць як антрапаморфным, так і тэрыаморфным, якая належыць: 1) пэўным нацыянальнасцям: *русское, китайское, цыганское, еврейское, народное*; 2) жывёлам: *щенячье, кошачье, заячье, воробьиное, поросячье*; 3) сям’і: *семейное, супружеское, семейно-родственное*. Выкарыстоўваючы класічную

сістэму бінарных апазіцый, прадстаўленую В. У. Івановым і В. М. Топаравым [2, с. 259–267], у дадзенай метафары можна таксама вылучыць наступныя апазіцыі: *всеобщее, коллективное – личное, человеческое единоличное, индивидуальное*; *женское, бабье, материнское, дамское – мужское*; *свое, личное – чужое*. Варта адзначыць, што жаночае шчасце нашмат больш верагоднае, чым мужчынскае, а індывідуальнае – больш праўдзівае.

У польскай мове праз дадзеную метафару звяртаецца ўвага на матэрыяльны бок шчасця, якое можна набыць: 1) звязанае з сям'ёй: *rodzinne* 'сямейнае', *szczęście w małżeństwie* 'шлюбнае', *szczęście w rodzinie* 'сямейнае'; 2) якое можна купіць: *się nie kupi* 'не купляецца', *kupi* 'купляецца'; 3) якое дае вышэйшая сіла: *błogosławione* 'благаслаўлёнае', *tajemnicze* 'таямнічае', *diabelskie* 'д'ябальскае'; 4) якое належыць жывёлам: *pieskie* 'сабачае', *skrzyłate* 'крылатае'; 5) якое належыць чалавеку: *człowiecze* 'чалавечае'; 6) агульнае – асабістае: *osobiste* 'асабістае', *pana* 'пана', *własne* 'уласнае', *innych* 'іншых'.

У калакацыях метафары *шчасце як локус* шчасцю прыпісваецца месцапалажэнне, дзе таксама можна вылучыць апазіцыю «верх – ніз»: рус. *неземное, межгалактическое, небесное – китайское, лесное, американское*; польск. *najwyższe* 'найвышэйшае' – *ziemskie* 'зямное'.

Адметнай з'яўляецца метафара *шчасце як ёмкасць*, у якой катэгорыя прадстаўляецца пэўнай субстанцыяй: рус. *переполненяет, вмещает, состоит, наполняет, бьет через край, неисчерпаемое*; польск. *rozpierało* 'разпірала', *nie mieści* 'не змяшчаецца'.

У метафары *шчасце як амплітуда* можна вылучыць апазіцыю «вялікі – малы», дзе рэпрэзентуецца наяўнасць вялікага шчасця; такую з'яву можна вытлумачыць тым, што калі шчасце малое, то гэта ўжо не шчасце: рус. *полное, огромное, большое, великое, превеликое, полнейшее, лишнее, редкое, маленькое*; польск. *duże* 'вялікае', *ogromne* 'вялізнае', *wielkie* 'вялікае', *niewielkie* 'невялікае', *większe* 'большае', *bezgraniczne* 'бязмежнае', *ograniczone* 'абмежаванае', *niezmierzone* 'нязмеранае'.

Найбольш колькасна прадстаўленай у рускай мове з'яўляецца метафара *шчасце як суб'ект*, дзе яно кадзіруецца праз антрапамарфічныя ўласцівасці: 1) рухаецца ці знаходзіцца ў бяздзеянні: *приходит, идет, бежит, промчится стоит, лежит, приходит, наступает, переваливается, шагает*; 2) выказвае пачуцці: *требует, улыбается, оправдывает, оправдывается*; 3) паварочваецца вакол сваёй восі: *оборачивается, отвернется*; 4) выконвае дзеянні, уласцівыя чалавеку: *получает, ждет, стучится, промчится, владеет, рождается, согласится, помогает, верит, прячется, выглядит, принесет*. У польскай мове шчасце таксама антрапамарфічнае, але калі ў рускай мове

яно ў большасці выпадкаў спрыяе, то ў польскай хутчэй выглядае як здраднік: 1) ілжэ: *zawodzi* ‘падманвае, здраджвае’, *zawiodło* ‘падманула’; 2) рухаецца: *szło* ‘ішло’, *przemija* ‘праходзіць міма’, *przyjdzie* ‘прыйдзе’; 3) паварочваецца вакол сваёй восі: *odwróciło się* ‘адвярнулася’, *odwraca się* ‘адварочваецца’; 4) адорвае: *dopisuje* ‘не падводзіць’, *zapanowało* ‘пануе’, *przynosi* ‘прыносіць’, *rodzi* ‘нараджае’, *przyniesie* ‘прынясе’, *daje* ‘дае’, *zapewnia* ‘забяспечвае’. Цікава тое, што шчасце ў польскай мове стварае апазіцыю «жывы – нежывы»: *zabite* ‘забітае’ – *żywe* ‘жывое’, *szczęście w życiu* ‘жыццёвае шчасце’.

У рускай мове з’яўляецца шэраг метафар, адрозных ад польскіх, дзе, напрыклад, катэгорыя шчасця прадстаўлена як ментальная адзінка ў метафары *шчасце як лёс*: *дается, зависит, выпадает, царит*. У канструкцыях *шчасце як нітка* відавочна сувязь з антычнай традыцыяй, дзе лёс чалавека прадстаўляўся ў якасці палатна: *перетянет, кончается, укорачивает, перемежается*. Адметнай для рускай мовы таксама з’яўляецца метафара *шчасце як газападобная субстанцыя*, што ўказвае на нематэрыяльны, больш хісткі яго характар: *погасит, выветривается, гасит, развеется, излучается*.

Шчасце таксама можа мець розныя адценні, якія выражаюцца прыметнікавай намінацыяй спектра колераў – *шчасце як вясёлка*: *голубое, бирюзовое, зеленое, чистое, радужное, отливает серебром*.

Адметна тое, што польская мова прэзентуе праўдзівасць шчасця (*шчасце як ісціна*): *prawdziwe* ‘праўдзівае’, *nieprawdopodobne* ‘непраўдападобнае’, *bajeczne* ‘казачнае’. Праз метафару *шчасце як абсалют* указваецца выключнасць шчасця: *niebywałe* ‘нечуванае’, *niezwykłe* ‘незвычайнае’, *wyjątkowe* ‘выключнае’, *niespotykane* ‘непераўзыдзенае’, *niespodziewane* ‘нечаканае’, *niezmącone* ‘незасмучанае’, *doskanałe* ‘дасканальнае’.

Выклікае вялікую цікавасць метафара *шчасце як вайна*, якая рэпрэзентуе этымалогіі лексемы *шчасце*: польск. służy ‘служыць’, *odstępuje* ‘адступае’, *nie odstępuje* ‘не адступае’, *zdobyczne* ‘трафейнае’. Кадзіроўка праз метафару *шчасце як зменнае* непасрэдна судакранаецца з папярэдняй метафарай: польск. *zmienne* ‘зменнае’, *nieodmienne* ‘нязменнае’, *trwałe* ‘пастаяннае’, *opuściło* ‘пакінула’, *opuszcza* ‘пакідае’, *parszywe* ‘паршывае’. У метафары *шчасце як спадарожнік* яно з’яляецца неад’емным складнікам вайны: польск. *sprzyja* ‘спрыяе’, *nie sprzyjało* ‘не спрыяла’.

Такім чынам, праведзены аналіз і шэраг метафар дазваляе сцвярджаць, што рускія адзінкі нам рэпрэзентуюць глыбокае духоўнае жыццё, дзе ўжо само з’яўленне шчасця – гэта вялікая ўдача. У польскіх калакацыях большасць спалучэнняў паказвае шчасце як матэрыяльную каштоўнасць, як з’яву, якая можа прыносіць што-небудзь лепшае, пра

што сведчыць, напрыклад, дзеяслоў *купіць*. Гэта нам дазваляе сцвярджаць, што ў моўнай карціне свету рускіх шчасце з'яўляецца, хутчэй, духоўнай каштоўнасцю, а ў польскай – матэрыяльнай.

Літаратура

1. *Ефремова Т. Ф.* Новый словарь русского языка. Толково-образовательный. 2-е изд., стереотип. М., 2001. Т. 2: П–Я.
2. *Иванов В. В., Топоров В. Н.* Исследования в области славянских древностей. М., 1974.
3. *Лакофф Дж., Джонсон М.* Метафоры, которыми мы живем // Теория метафоры. М., 1990.
4. Этимологический словарь русского языка. Т. 1–4 / Ред. М. Фасмер. М., 1986–1987.
5. *Boryś W.* Słownik etymologiczny języka polskiego. – Kraków, 2005.
6. Słownik współczesnego języka polskiego. T. 1–2 / Red. B. Dunaj. Warszawa, 1996.
7. Uniwersalny słownik języka polskiego. T. 1–4 / Red. St. Dubisz. Warszawa, 2003.
8. *Wierzbicka A.* Język-umysł-kultura. Warszawa, 1999.

ЗВАРОТНЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ МОВАХ: СПРОБА ПАРАЎНАЛЬНАГА АНАЛІЗУ

Я. У. Дзьобік

Зваротныя дзеясловы і катэгорыя зваротнасці актыўна вывучаліся як у XX стагоддзі (В. В. Вінаградаў, Н. С. Авілава, А. В. Ісачанка, М. Т. Кавалёва, Б. Ю. Норман, Н. А. Янка-Трыніцкая, М. А. Шалякін і інш.), так і на сучасным этапе (І. С. Бяляева, Д. А. Ашурава, В. В. Чагіна, С. Л. Лукіна і інш.). За гэты даволі працяглы час сфармаваліся розныя падыходы да вызначэння статусу зваротных дзеясловаў.

У межах граматычнага падыходу зваротныя дзеясловы даследаваліся выключна ў кантэксце даволі супярэчлівай і заблытанай праблемы катэгорыі стану. Варта адзначыць, што «агульнапрынятага азначэння катэгорыі стану ў мовазнаўстве няма» [6], але большасць даследчыкаў вылучае толькі дзве формы стану: актыў і пасіў. Пачаў развіваць гэтую канцэпцыю А. В. Ісачанка ў сваёй працы «Грамматический строй русского языка в сопоставлении с словацким» [2].

А. В. Ісачанка звяртаў увагу на неадназначнасць функцый постфікса -*ся*, якая спрычынілася да блытаніны ў вызначэнні катэгорыі стану. На думку даследчыка, усе дзеясловы, якія не маюць формы залежнага стану, адносяцца да незалежнага стану. Зваротныя дзеясловы ён прапаноўвае разглядаць як словаўтваральныя класы. Такім чынам, паступова з'явіліся перадумовы для ўзнікнення іншага падыходу да вырашэння дадзенай праблемы – лексіка-граматычнага.